Анализ сокращений слов Киевской Псалтири позволяет сделать вывод о том, что в уставном кириллическом письме появление и существование сокращений имело как сакрально-символические, так и практические причины.

**Литература**

1. Киевская Псалтирь 1397 года (факсимильное издание 1976 г.).

## РАБАВАННЕ МЯСЦОВАГА НАСЕЛЬНІЦТВА ПАДЧАС ПОЛЬСКАЙ АКУПАЦЫІ 1919–1920 ГАДОЎ

**В. М. Бароўская**

У выніку паспяховых ваенных дзеянняў Польшчы на пачатку польска-савецкай вайны амаль уся тэрыторыя Беларусі была занята польскімі вайсковымі часткамі. На гэтых землях пачаў усталёўвацца акупацыйны рэжым. Галоўным кіруючым органам стала Грамадзянскае Упраўленне Усходніх зямель (Zarząd Cywilny Ziem Wschodnich). Быў уведзены новы адміністрацыйны падзел зямель на акругі (Брэсцкая, Валынская, Мінская, Віленская), паветы і гміны. Але ўсталяванне новай адміністрацыі і кіравання суправаджалася выпадкамі даволі частага рабавання і марадзёрства з боку польскіх войскаў і жандармерыі. Асноўнымі ж прычынамі рабавання мясцовага насельніцтва былі хутчэй за ўсё дрэннае матэрыяльнае забеспячэнне польскіх вайсковых частак, адсутнасць дысцыпліны. Большасць вайскоўцаў лічылі гэтыя тэрыторыі часова занятымі. Таму, на іх думку, тут можна было забіваць і рабаваць. Многае залежала тут і ад паводзін камандзіраў. Так, у Маладзечне летам 1919 г. інцыдэнты паміж насельніцтвам і пазнанскімі атрадамі былі своечасова папярэджаны афіцэрамі [6, с. 35]. Але не паўсюль так адбывалася. Даволі часта рабаваннем займаліся і самі афіцэры, што вылівалася ў сапраўдную трагедыю для мясцовага насельніцтва.

Найбольш поўна выпадкі рэквізіцый і рабавання можна прасачыць праз агляд заяў грамадзян БССР, пададзеных у 1924 г. у адрас Таварыства садзейнічання ахвярам інтэрвенцыі. Значную частку з гэтых заяў займае корпус дакументаў пад назвай «Заявы грамадзян Глускага раёна аб стратах, учыненых белапольскай акуцыяй», які мае ў сабе 154 заявы вясковых гаспадароў [2, с. 143]. Збольшага заявы напісаны на стандартным бланку-апытальніку Таварыства, дзе змяшчалася інфармацыя па 12 пазіцыях. З іх мы можам атрымаць розныя звесткі, пачынаючы ад прозвішча, імя, імя па бацьку абрабаванага гаспадара і да інфармацыі аб прозвішчы і месцы жыхарства сведкаў, якія могуць пацвердзіць наяўнасць паказаных стратаў. Падобныя звесткі маюцца і па іншых

раёнах. Даволі часта паказчыкі розных форм рабавання ў бланках-апытальніках розных рэгіёнаў супадаюць, што сведчыць аб іх аб'ектыўнасці. Так, прааналізаваўшы 87 заяў пацярпелых па Асіповіцкім раёне па 8–10 пунктах выяўлена 17 выпадкаў збіцця і аніводнага забойства, гэта 19, 5 % ад агульнай лічбы (з 1918–1920 гг.), што блізка да статыстыкі па Глускаму раёну (20 %). Але ў Асіповіцкім раёне не атрымана ніводнай скаргі па рэквізіцыі, калі ў Глускім раёне іх было ажно 29 выпадкаў.

Агляд заяў Таварыства садзейнічання ахвярам інтэрвенцыі па Глускаму і іншым раёнам дае нам поўную карціну становішча ў большай ступені сельскага насельніцтва. Але акрамя вясковага насельніцтва, якое пераважала на беларускіх землях, значна пацярпелі і жыхары мястэчак і гарадоў.

Выразным прыкладам стану мяшчан падчас польскай акупацыі з'яўляецца апісанне становішча мястэчка Урэчча Мінскай губерніі. Як і кожнаму населенаму пункту ваенныя дзеянні, а разам з тым і акупацыя, прынеслі немала шкоды. Калі паглядзець на становішча мястэчка пасля ліпеня 1920 г. (калі Чырвоная Армія прымусіла адступіць польскіх вайскоўцаў), то паўстае жудасная карціна. Усходняя частка Урэчча амаль уся згарэла, захаваліся толькі некаторыя будынкі [3, с. 167]. Наконт звестак аб прычынах пажараў, некаторыя жыхары вінавацяць ва ўсім палякаў, якія пры адступленні мусілі запаліць горад, каб яго маёмасць не засталася савецкім уладам. Таксама ёсць паведамленне аб удзеле ў гэтай справе бальшавікоў. Але хто б не падпаліў мястэчка, усё роўна яно згарэла.

Значна пацярпела і гарадское насельніцтва. Так, у Мінску была разбурана вялікая колькасць будынкаў вайсковага характару, таксама абодва чыгуначныя вакзалы, чыгуначны мост праз вуліцу Маскоўскую, мясцовы вайсковы шпіталь, месцамі выпалены цэлыя кварталы, у тым ліку мукамольня, разбурана шмат гандлёвых устаноў [2, с. 146]. Тысячы сем'яў былі абрабаваны на мільёны рублёў. Было забіта каля 100 чалавек. Патрэбна заўважыць, што жорсткія адносіны да мясцовага насельніцтва былі характэрны не заўсёды, але гэтага хапіла, каб матэрыяльнае становішча жыхароў значна пагоршылася.

Акрамя масавых пажараў, рабаванняў, рэквізіцый, вельмі распаўсюджанай з'явай былі арышты і заключэнне ў лагеры для далейшага ўтрымання. У першую чаргу пад рэпрэсіі траплялі камуністы, прыхільнікі савецкай улады, чырвонаармейцы, і асабліва чырвонаармейцы-палякі. Але і мірнае насельніцтва падвяргалася заключэнню. Як узгадвае ў сваіх успамінах І. Антонаў, найбольш «недобранадзейнымі» лічыліся яўрэі, беларусы-праваслаўныя, беларускія настаўнікі [1, с. 29]. Арыштаваных

звозілі ў бліжэйшую турму (у асноўным у былы губернскі горад) і там трымалі амаль без вырашэння справы. Большую частку з іх усё роўна адпускалі на волю. Але адзначаюцца і выпадкі катавання, фізічнага і маральнага знішчэння. Тыя жудасныя карціны, якія ўзгадваюць сведкі падзей і дакументы, ніколі не апраўдаюць польскія ўлады. Адна з найпершых мукаў была так званая «бачносць»: арыштаванага ставілі тварам да сцяны, забараніўшы адварочвацца, і гэтак маглі трымаць некалькі дзён [5, с. 10].

Акрамя турмаў існавалі лагеры для больш доўгага турэмнага зняволення. Але патрэбна заўважыць, што ў лагеры, якія у большай масе сваёй знаходзіліся на тэрыторыі Польшчы, накіроўваліся чырвонаармейцы і прадстаўнікі бальшавіцкай партыі. Самым знакамітым лагерам лічыцца лагер у Дамбе пад Кракавам [8, с. 29].

Нельга не звярнуць увагу на ўзаемадносіны палякаў з прадстаўнікамі розных этнасаў, якія пражывалі ў той час на беларускіх землях. Так згодна з афіцыйнай нацыянальнай палітыкай на тэрыторыі «усходнìх крэсаў» пражывалі тры асноўныя этнічныя суполкі: «маскалі», «жыды» і палякі [1, с. 35]. Галоўным прынцыпам выдзялення гэтых груповак быў этна-канфесіянальны фактар. Але ж калі параўнаць гэтае дзяленне з перапісам 1907 г., то на тэрыторыі Беларусі ў асноўным пражывалі беларусы – з іх большасць праваслаўных; таксама былі літоўцы, рускія, яўрэі, палякі і іншыя нацыянальныя меншасці [4, с. 51]. Таму выдзяленне толькі трох нацыянальных груповак было памылковым, і ў першую чаргу яно адпавядала палітычным мэтам Польскай дзяржавы. З аф1цыйным пунктам гледжання беларусы-праваслаўныя, якіх было нямала нават у заходніх паветах, а таксама рускія прылічваліся да «маскалёў», а то нават і да бальшавікоў. Палякамі ж лічыліся не толькі мясцовыя палякі, але і беларусы-каталікі, сярод якіх каталіцкія святары праводзілі прапольскую агітацыю. Але ж нельга і адмаўляць той факт, што не ўсё беларускае каталіцкае насельніцтва лагодна адносілася да Польшчы, так як яны таксама з’яўляліся аб’ектамі рэквізіцый з боку польскага войска. Таму выраз «як у хрыста за пазухай» не заўсёды адпавядаўстановішчу беларускага каталіцкага насельніцтва ў гэтай вайне. Наконт жа яўрэйскага насельніцтва (так званыя «жыды»), якое ў той час складала значную частку сярод мяшчан і было больш заможным у параўнанні з іншымі, то яны падлягалі актыўным рэквіцыям, гвалту. Складалі тую частку насельніцтва, якая лічылася асноўнымі ворагамі (канечне ж пасля «маскалёў»). Найбольш распаўсюджанай формай ганьбавання яўрэйскага насельніцтва было абрэзванне барод і пэйсаў, што лічыцца вельмі абрыдлівым для іудзеяў [1, с. 51]. Таксама акрамя нацыянальнай

*Табліца*

**Агульная табліца страт падчас польскай акупацыі**

| Паветы | У залатой валюце, руб. | У савецкіх рублях 1919-1920 гг., руб. | У нікалаеўскай валюце |
|---|---|---|---|
| Мінскі | 13763167 | 914004519 | 38752666 |
| Бабруйскі | 1037326 | – | – |
| Барысаўскі | 3254392 | 8120202500 | – |
| Ігуменскі | 1744623 | 1300 | – |
| Мазырскі | 19721 488 | – | – |
| Слуцкі | 3508282 | – | 22747 |
| Разам | 52029281 | 9034208319 | 38775413 |

нянавісці, яўрэі былі найбольш багатым слоем, і таму з’яўляліся добрай крыніцай узбагачэння для польскіх жаўнераў і афіцэраў.

Яскравым сведчаннем памераў рабавання беларускіх зямель з'яўляюцца дадзеныя наступнай табліцы

З усяго вышэй сказанага можна зрабіць выснову, што за невялікі прамежак часу акупацыі матэрыяльнае становішча мясцовага насельніцтва значна пагоршылася. Акрамя рабаванняў і рэквізіцый, польская акупацыя прынесла з сабою палітыку знішчэння нацыянальнай свядомасці беларускага насельніцтва праз ажыццяўленне арыштаў і забойстваў.

### Літаратура


1. *Антонаў І. Г.* Успаміны аб польскай акупацыі Горадзеншчыны ў 1919–1921 гг. Гродна, 1921.
2. *Астрога В.* Пад крыламі белага арла // Полымя. 2001. №8. С. 140–154.
3. Белоруссия в борьбе против польских захватчиков 1919–1920 гг. М., 1940.
4. *Езовитов К.* Белорусы и поляки. Ковно, 1919.
5. *Луцкевіч А.* Польская акупацыя ў Беларусі. Вільня, 1920.
6. *Мілеўскі Я. Е.* Адносіны польскіх войск да насельніцтва Беларусі (1919–1920 гг.) // Бел. гіст. часопіс. 1996. № 4. С. 32–43.
7. *Михутина И. В.* Польско-советская война 1919-1920 гг. М.: ИСБ РАН, 1994.
8. Польско-советская война 1919–1920 гг. Ч. 2. М.: ИСБ РАН, 1994.
9. *Ціхаміраў А. В.* Беларусь у палітыцы Польшчы ў канцы 1918 – пачатку 1921 гг. // Весн. Брэсц. ун-та. Сер. 2. 2005. №2. С. 59–66.


## ПАДСКАРБІ ЗЕМСКІ ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА Ў XV-XVI стст.: ДЗЕЙНАСЦЬ І ЭВАЛЮЦЫЯ ЎРАДА

**Д. С. Буцін**

Кіраванне дзяржаўнымі грашыма, скарбам і ўвогуле фінансамі – справа вельмі складаная, менавіта ёй і займаўся адзін з самых значных урадаў, у шэрагу з канцлерскім, ВКЛ – падскарбі земскі (першым вядо-